


# Развіццё навукі — найважнейшы прыярытэт

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка 30 ліпеня сустрэўся з рабочай групай па аналізе дзейнасці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.**

Гэта група створана па распараджэнні Кіраўніка дзяржавы ў чэрвені. Яна працуе на пастаяннай аснове і павінна вывучаць пытанні практыкаарыентаванасці і рэзультатыўнасці навуковых даследаванняў і распрацовак НАН Беларусі, укаранення распрацовак у галінах эканомікі і сацыяльнай сферы, распрацоўкі імпартазамяшчальнай прадукцыі і тэхналогій, экспарту навукова-тэхнічнай прадукцыі. Штогод група будзе прадстаўляць Прэзідэнту даклад аб выніках работы і прапановы па вырашэнні выяўленых праблем.

Як падкрэсліў ва ўступным слове Кіраўнік дзяржавы, Беларусь цяпер знаходзіцца на такім этапе развіцця, калі без навукі немагчыма зрабіць ніякага руху наперад. У Беларусі займаюцца навуковымі даследаваннямі як прыкладнога, так і фундаментальнага характару.

— Навуцы мы аддаём усе прыярытэты, без яе развіццё немагчыма. Але апошнім часам я бачу, што Акадэмія навук дапускала сур'ёзныя пралікі. Гэта таксама бывае. Навука — такая рэч, калі даводзіцца ісці непраторанымі шляхамі, калі трэба асвойваць сур'ёзныя праблемы, браць вяршыні. Таму, зразумела, памылкі магчымы. Але, што мяне насцярожыла, што памылкі дапускаліся Акадэміяй навук там, дзе іх быць не павінна, дзе мы ўжо нечаму навучыліся: у жывёлагадоўлі, у раслінаводстве, — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што з першых дзён прэзідэнцтва ставіў працу вучоных у аснову ўсіх пераўтварэнняў у жыцці грамадства.

— Развіццё айчыннай навукі — найважнейшы прыярытэт дзяржаўнай палітыкі, — заявіў беларускі лідар. — У свой час мы не далі знішчыць навуковыя школы і шматгадовыя напрацоўкі. Зрабілі ўсё магчымае для іх захавання. З якімі фундаментальнымі, стратэгічнымі распрацоўкамі мы ўвойдзем у новыя сярэдне- і доўгатэрміновую праграмы развіцця рэспублікі? Ці гатовы забяспечыць свой тэхналагічны суверэнітэт у цяперашніх рэаліях?

Аляксандр Лукашэнка таксама падкрэсліў, што той, хто валодае высокім званнем вучонага, павінен быць самым актыўным правадніком дзяржаўнай пазіцыі.

— Кажуць, што навука не мае айчыны. Але вучоныя нараджаюцца, вучацца і дасягаюць пэўных вышынь, з'яўляючыся грамадзянамі сваёй краіны. Большасць вялікіх вучоных — сапраўдныя патрыёты. Скажу больш: грамадзянін з высокім званнем вучонага павінен быць самым актыўным правадніком дзяржаўнай пазіцыі, — падкрэсліў Кіраўнік дзяржавы.

Паводле сайта president.gov.by